холод они выполняли свой долг. И словами песни: «Мы пол-Европы по-пластунски пропахали» все сказано.

Я смотрела очень хороший фильм о войне «В бой идут одни «старики»». И там главный герой, капитан Титоренко, когда летчики спорили, какая, первая или вторая эскадрилья распишется на Рейхстаге, сказал: «Первым на Рейхстаге распишется рядовой пехоты Ваня. Да и по праву». И я горжусь, что роспись моего деда Николая была на Рейхстаге.

Очень жаль, что Великая Отечественная война не оказалась последней. Еще много раз нашим ребятам приходилось участвовать в военных конфликтах. Афганистан и Ангола, Ближний Восток и Вьетнам. Везде воевала и гибла наша молодежь. И это время тоже коснулось моей семьи. Мой родной дядя, Полевцов Александр, выполнял интернациональный долг в Эфиопии.

Мне очень обидно, когда многие мои сверстники говорят, что это все ерунда, все было не так, это неинтересно. Может быть, мой рассказ о войне в судьбе моей семьи позволит им взглянуть на нашу историю по-другому.

Я горжусь моими родными, защищавшими нашу землю. Я преклоняюсь перед всеми ветеранами, освободившими мир от «коричневой чумы». А ведь их осталось так мало. Ведь прошло уже почти 70 лет со дня Победы.

Я счастлива, что мы живем в мирной, спокойной стране. И я хочу, чтобы никогда война своими черными щупальцами не коснулась больше ни одной семьи.

Радчикова Дарья,
студентка факультета
международных бизнес-коммуникаций

Электронная библиотека БГЭУ

## Вайна – ранай страшэннай на целе маёй Беларусі, у памяці маёй сям'і…

Мы не можам забыць.
Наша горкая гордасць
Прасвятлее ў вяках.
*Пімен Панчанка*

Памяць… Кожны чалавек павінен ведаць і шанаваць гісторыю сваёй зямлі, старонкі гісторыі сваёй сям'і. Чалавечае жыццё хуткаплыннае, але варты працягу толькі той народ, хто ўмее памятаць мінулае, перасцерагаецца яе трагічных паўтораў у сучасным, каб годна

ісці да будучыні. Усе тыя дзівосныя гісторыі, што людзі пакідаюць па сабе, існуюць да тае пары, пакуль існуе нашая памяць.

У кожнай сям'і ёсць тое сакральнае, што існуе ў душы кожнага, нягледзячы на ўзрост і стан. Для маёй сям'і гэтая сакральнасць звязаная з памяццю вайны, з ушанаваннем яе ахвяр і герояў, з падзякай пераможцам. Гэта Павага да тых, хто зрабіў вялікі ўнёсак у заканчэнне той жудасці і страху, што запаланілі калісьці ўвесь свет. Полымя вайны ў сорак першым ахапіла і маю сям'ю. Успаміны родных жывяць нашу свядомасць, нашу памяць. Мы будзем памятаць...

Калі пачалася вайна, маёй прабабулі было 13 гадоў, а яе брату Міколе не было і года. Бацька прабабулі, Сцяпан, пайшоў на вайну ў першыя яе тыдні. Лісты ад яго прыходзілі не часта, таму ніхто не ведаў, ці жывы ён. Маці прабабулі, Марына, засталася адна на гаспадарцы і з дзецьмі, у акупаванай немцамі роднай вёсцы. Напачатку немцы мірных жыхароў не чапалі, толькі пыталіся, дзе ёсць партызаны, але вяскоўцы трымаліся моўчкі.

Аднойчы раніцай маці прабабулі пайшла ў хлеў карміць жывёлу. Пакуль завіхалася па гаспадарцы, у хату трапіла авіябомба. Імгненна ўся хата зайшлася полымем, здавалася, што дзетак з яе ўжо не выратаваць... Праз колькі сутак жанчына апрытомнела ў доме суседкі. Разам з ёй былі... і яе дзеці. Выратавала! Як тое шчасце-дзіва адбылося, не памятала, бо перажыла моцны шок і ўжо да таго часу хворае сэрца дало ізноў знак па сабе. Ёй рабілася ўсё горш.

Пакуль маці не захварэла на сэрца, мая прабабуля, яшчэ падлетак, за «лустачку хлеба» для сям'і дапамагала аптэкару, старому немцу, які жыў у горадзе яшчэ з паваенных часоў, прадаваць лекі. Надзея вырашыла ісці ў аптэку ў горад. Дапамагаць «савецкім» было забаронена, але немец-фармацэўт усё ж пашкадаваў дзяўчынку і не збаяўся нават пад пагрозай свайму жыццю даваць ёй лекі для маці. З учынку гэтага чалавека я зразумела, што міласэрнасць – вялікі дар, і не кожны можа заставацца чалавечным. Адным разам аптэкару не ўдалося паспрыяць Надзейцы, і тая, вярнуўшыся ні з чым дадому, ужо не застала маці...

Выпала Надзеі адной гадаваць маленькага брата. Прабабуля казала мне: «Ліхалецце... Я тады рабіла ўсё, каб Міколка не адчуваў таго страху, што быў у маім сэрцы. Мы жылі не каб жыць, а каб выжыць! Каб дачакацца бацьку з перамогай! Не было чаго есці. У халады амаль не было што апрануць. Жылі ў зямлянцы. Жудасны быў час!»

Аднойчы ў вёску прыехалі немцы, каб забраць хлопцаў і дзяўчат на працу ў Германію. Кожны ратаваў сваіх дзетак як мог. Надзі не было куды хавацца. Яе загналі ў грузавік, дзе ўжо былі дзясяткі юных, якія вымушаныя з'ехаць ад родных, не ведаючы куды, чаму і ці назаўсёды. Тады Надзя пачала прасіць: «Майму брату і так няма чаго есці, няма каму апекавацца ім. Ён памрэ без мяне. Злітуйцеся, уратуйце Міколку майго! Ці ж у вас няма родных і дзетак?» Немец, які садзіў прабабулю ў



Электронная библиотека БГЭУ

грузавік, пачуў яе і... адпусціў. Можа ён разумеў мову, можа проста стала шкада, магчыма, машына ўжо была запоўненай, а магчыма, яго ўзрушыла тая роспачная мальба ў голасе ды вачах дзяўчынкі... Можа... Ніхто не ведае адказу, але ж і сярод ворагаў бываюць літасцівыя людзі...

Набліжаўся фронт, і праз колькі часу немцы сышлі. Аб тым, што вайна скончылася, Надзея з братам даведаліся ад бацькі Сцяпана, які вярнуўся з вайны. Памятаю, прабабуля згадвала: «Мы былі такія шчаслівыя. Не маглі ніяк з Міколкам нарадавацца: скончылася вайна, бацька вярнуўся, знайшоў нас! Мы ўсё не давалі веры, што гора скончылася!!!»

Бацька прабабулі прайшоў усю вайну без раненняў. Дайшоў да Берліна і вярнуўся з падарункамі: швацкай машынкай і тканінамі, шыкоўнымі, як ўзгадвала прабабуля, якая папахадзіла ў вайну ў рыззі і цяпер з асалодай магла насіць самастойна пашытыя прыгожыя сукенкі. Гэтая машынка працуе і сёння!

Жыццё пасля вайны пачалося нанова. Дзед Сцяпан паставіў новую хату. Цяпер у гэтай хаце ўлетку жывём мы. Гэты дом – наша сакральнае жытло: у ім нават печ, агмень хаты, засталася тая ж!

Бацька прабабулі меў высокую ўзнагароду – Ордэн Чырвонай Зоркі. Такіх адзнак было мала ў вёсцы, таму дзед стаў яе героем, нягледзячы на тое, што быў на вайне радавым. На маю думку, радавыя той вайны, салдаты – і ёсць наш найпершы гонар, нашыя сапраўдныя героі, чыім жыццём, чыёй мужнасцю і была здабытая Перамога ў 1945 годзе! Нядаўна мы знайшлі ў сецеве архіў «Подзвіг народа», у якім ёсць дакладныя звесткі пра ветэранаў вайны, пра тых, хто і за што мае высокія ваенныя ўзнагароды. Мы даведаліся пра подзвіг нашага радавога Сцяпана. У час вайны Ільін Сцяпан Іванавіч спачатку працаваў на будаўніцтве абарончых рубяжоў, потым дасканала асвоіў тэхніку размініравання, стаў камандзірам аддзялення размініравання. Яго аддзяленне абясшкодзіла амаль 10 000 мін, тым самым выратавала тэрыторыю ў 4000 гектараў і людзей на ёй.

Па расказах прабабулі яе бацька быў вельмі вытрыманым чалавекам. Цяпер я разумею чаму: толькі смелыя, адважныя мужчыны маглі «працаваць» з мінамі і вярнуцца з вайны без ніводнай драпіны. Я ганаруся, што ў памяці маёй сям'і, маёй краіны назаўсёды прапісана і гісторыя радавога Сцяпана Іванавіча Ільіна!

Тая вайна назаўсёды пакінула след у нашай гісторыі, у сэрцах мільёнаў. Раны вайны загаіліся, але па іх засталіся рубцы на памяці. Памяць пра Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне павінна жыць, а мы і нашыя нашчадкі – шанаваць мінулае, каб быць вартымі сваіх продкаў!



Электронная библиотека БГЭУ
БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by